# Інфаграфіка на ўроках беларускай літаратуры: аспекты стварэння і выкарыстання

Візуалізацыя вучэбнай інфармацыі як эфектыўны сродак фарміравання прадметных і метапрадметных кампетэнцый вучняў

**А. Ф. Кузьміч,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
Кушлікоўскай  базавай школы
Полацкага раёна

**Візуалізацыя – трэнд сучаснай адукацыі, які дазваляе задзейнічаць розныя каналы ўспрымання інфармацыі, выпрацоўваць уменні аналізу і разумення тэксту, абагульнення аб'ёмнага матэрыялу.**

Візуалізацыя навучальнага працэсу садзейнічае як удасканаленню навыкаў работы з інфармацыяй, так і развіццю розных відаў маўленчай дзейнасці: чытання, гаварэння, пісьма.

Існуюць традыцыйныя спосабы візуалізацыі інфармацыі на ўроках: схемы, апорныя канспекты, табліцы, планы, прэзентацыі, відэаролікі і інш. Аднак сёння з развіццём камп'ютарных тэхналогій набываюць папулярнасць новыя сродкі. Адным з іх з'яўляецца інфаграфіка.

**Інфаграфіка** – гэта набор малюнкаў, дыяграм і мінімальнага тэксту, які дае магчымасць разумення тэмы. Асноўнай мэтай інфаграфікі з'яўляецца інфармаванне аб якой-небудзь праблеме, з'яве, аб шэрагу фактаў. Інфаграфіка можа быць карыснай, калі неабходна даць кароткі агляд тэмы, растлумачыць складаны працэс, паказаць вынікі даследавання або дадзеныя

апытання, падвесці вынік паведамленням, тэкстам, артыкулам, параўнаць і супаставіць некалькі паняццяў, падзей, вобразаў, прадставіць пэўныя ідэі.

**Этапы стварэння інфаграфікі:**

1. Выбар тэмы і ідэі.
2. Даследаванне тэмы (вылучэнне даных) і збор інфармацыі.
3. Аналіз інфармацыі. Падзел інфармацыі на раздзелы, часткі, пункты. Кожны раздзел неабходна прадставіць асобным малюнкам або графікам, падабраць патрэбныя візуальныя вобразы, знаёмыя аўдыторыі.
4. Стварэнне эскіза (лепш зрабіць на паперы). Падбор ілюстрацый (малюнкаў), якія адлюстроўваюць асноўныя палажэнні для выяўлення ў інфаграфіцы.
5. Рэдагаванне эскіза.
6. Непасрэднае стварэнне інфаграфікі.

Эфектыўнасць выкарыстання інфаграфікі залежыць ад таго, як падаецца інфармацыя, якія ствараюцца вобразы для перадачы паведамлення, якое неабходна данесці да аўдыторыі. Нават размяшчэнне і групоўка элементаў на старонцы ўплывае на тое, як чытачы будуць успрымаць матэрыял. Вылучэнне ўзаемасувязяў з дапамогай базавых элементаў дызайну – межаў, ліній і фігур – дапамагае лепш зразумець структуру і змест інфаграфікі. З дапамогай розных шрыфтоў ствараецца дакладная іерархія тэксту – для галоўнага загалоўка, для загалоўкаў раздзелаў і для асноўнага тэксту. Візуальныя элементы робяць інфармацыю цікавай і запамінальнай.

Спецыяльных інструментаў для стварэння інфаграфікі няма. Выкарыстоўваць звычайныя графічныя рэдактары: Adobe Illustator, Adobe Photoshop, PowerPoint. У інтэрнэце прадстаўлена мноства сэрвісаў, якія дазваляюць ствараць розныя віды інфаграфікі як па шаблонах, так і з чыстага ліста: piktochart.com, canva.com, infogr.am, visual.ly, genially.

**Canva** з’яўляецца адным з самых простых анлайн-рэдактараў для стварэння інфаграфікі. Для працы з ім не патрабуецца доўгае навучанне, створаная інфаграфіка выглядае цікавай і лёгкай для ўспрымання. Рэгістра-

цыя ў сэрвісе бясплатная, але абавязковая. Ёсць магчымасць хутка зарэгістравацца з дапамогай акаўнта ў адной з сацыяльных сетак. Неабходна зайсці на сайт Canva і выбраць шаблон – «Інфаграфіка». Сам рэсурс прапануе мноства шаблонаў. Перш чым прыступіць да працы з шаблонам, трэба старанна прадумаць ідэю самаго малюнка. І нават падабраць усе нарыхтоўкі, тэксты, зрабіць папяровы макет.

У інструмент убудаваны шырокі каталог элементаў: геаметрычныя фігуры, рамкі, фоны, малюнкі і ілюстрацыі, графікі і дыяграмы, фатаграфіі. Калі праца над дызайнам завершана, гатовы макет можна спампаваць на камп'ютар у адным з трох фарматаў – JPEG, PNG або PDF.

Методыка працы з інфаграфікай такая ж, як і з наглядным дапаможнікам. Вучням прапануюцца заданні, накіраваныя на:

– аналіз інфармацыі;

– супастаўленне прыведзеных фактаў;

– фармулёўку высноў;

– абагульненне і пастаноўку пытанняў да прадстаўленай інфармацыі;

– функцыянальнае чытанне (апішыце прадстаўленага персанажа (падзею); уявіце даныя ў таблічнай форме; складзіце аповед (план); дапоўніце адсутныя ў тэксце дадзеныя; адкажыце на пытанні і г.д.).

Інфаграфіка адрозніваецца ад звыклай прэзентацыі тым, што гэта ўсяго адзін слайд, на якім размяшчаецца ўся неабходная інфармацыя па тэме. Складаны матэрыял з дапамогай інфаграфікі засвойваецца вучнем хутка, бо графічная інфармацыя, па меркаванні шматлікіх навукоўцаў, запамінаецца лягчэй, чым тэкставая. Інфаграфіка спрыяе развіццю навыкаў маўлення, бо ў вучня няма гатовага тэксту, а толькі інфармацыя, пры дапамозе якой можна пабудаваць сваё выказванне. Такім чынам, інфаграфіку не чытаюць у звыклым сэнсе, а вывучаюць, робяць высновы і ствараюць уласны тэкст. Інфаграфіка з'яўляецца выдатнай «новай старой» тэхналогіяй, выконвае аналітычную, канструктыўную, адаптыўную, экспрэсіўную і эстэтычную функцыі. Менавіта вербальныя і графічныя складнікі інфаграфікі ў

сукупнасці робяць яе зручным і цікавым аб’ектам вывучэння на ўроках літаратуры ў сучаснай школе.

Прапануем разгледзець розныя варыянты інфаграфікі, створанай да ўрокаў беларускай літаратуры ў 7 класе.

На ўроку літаратуры па тэме «Якуб Колас. «У яго быў свет цікавы…» (урывак з паэмы «Сымон-музыка») мэтазгодна выкарыстаць наступную інфаграфіку.



Для актуалізацыі наяўных ведаў аб жыцці і творчасці Якуба Коласа вучням прапануецца ўважліва разгледзець інфаграфіку і адказаць на пытанні: у госці да якога мастака слова мы сёння завітаем? (Якуба Коласа). Назавіце сапраўднае прозвішча пісьменніка. (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч). Паглядзіце ўважліва на партрэт і скажыце, якімі рысамі характару, на вашу думку, валодае гэты чалавек. (Пранікнёны, удумлівы позірк, разважлівасць, сур'ёзнасць, добразычлівасць, інтэлігентнасць і г.д.) Што вы ведаеце пра жыццёвы лёс Якуба Коласа?

З дапамогай воблака слоў у выглядзе кнігі вучні ўзгадваюць творы Коласа, з якімі ўжо знаёміліся («У старых дубах», «Песня ляснога жаваранка», «Крыніца», «Новая зямля», «Конь і сабака»), называюць іх жанры (апавяданне, літаратурная казка, паэма, байка).

Падвесці вучняў да тэмы і вызначыць задачы ўрока можна пры дапамозе наступных пытанняў: Які твор мы сёння будзем разглядаць? (Урывак з паэмы «Сымон-музыка»). Хто з'яўляецца яго галоўным героем? На якое ключавое пытанне мы павінны даць адказ? Якія задачы паставіць перад сабой?

Прачытаўшы ўрывак з паэмы, вучні павінны ахарактарызаваць Сымона, даць адказ на пытанне «Чым Сымонка не падобны на другіх?» У гэтым ім дапамогуць малюнкі, надпісы пад імі, якія неабходна патлумачаць або даказаць радкамі з твора. Прасочваецца сувязь з іншымі відамі мастацтва.

У канцы ўрока размова пойдзе пра талент, ролю таленавітых людзей у жыцці грамадства. Вучні прыходзяць да высновы, што Сымонка не падобны да другіх, ён валодае талентам, які не кожны можа разгледзець. У якасці творчага задання вучням на аснове інфаграфікі прапануецца падрыхтаваць вуснае выказванне «З чаго складаецца Сымонкаў «свет цікавы»?»




Матываваць вучняў на вывучэнне тэорыі літаратуры досыць складана, бо часта літаратуразнаўчыя тэрміны не выклікаюць асаблівай цікавасці. Падчас вывучэння раздзела падручніка «Загадкавая краіна Паэзія» карысным будзе выкарыстанне інфаграфікі «Пра вершаскладанне». Яна ўяўляе сабой апорны канспект па тэорыі літаратуры, дзе разглядаюцца такія прыметы верша, як рытм, стапа, памер, рыфма, страфа. Для вучняў гэта даволі складаная тэма, асабліва калі неабходна вызначыць вершаваны памер. Таму тэкставы матэрыял падручніка лепш прапанаваць у выглядзе

інфаграфікі, зрокава дазваляе больш эфектыўна ўспрымаць і засвойваць новы матэрыял.

Інфаграфіка «Пра вершаскладанне» з’яўляецца карысным сродкам падчас працы з высокаматываванымі вучнямі пры падрыхтоўцы да алімпіяды (вывучэнне тэорыі літаратуры), да напісання водгуку на вершаваны твор.




Інфаграфіку па тэме «Якуб Колас. «Дзядзька-кухар». Вобраз дзядзькі Антося» мэтазгодна прымяняць як аснову для пераводу інфармацыі з адной

знакавай сістэмы ў іншую, што дазваляе засяродзіць увагу вучняў на асноўных рысах характару дзядзькі Антося, прааналізаваць прыёмы стварэння вобраза.

Інфаграфіка добра сябе зарэкамендавала падчас працы са слабымі вучнямі, якія з задавальненнем пераказваюць мастацкі тэкст з яе дапамогай, складаюць план характарыстыкі дзядзькі Антося. Высокаматываваныя вучні могуць выконваць больш складаныя заданні па складанні тэксту публіцыстычнага стылю («Чаму можна навучыцца ў галоўнага героя?») ці мастацкага (скласці аповед пра дзядзьку Антося).



Інфаграфіка па тэме «Змітрок Бядуля. «Шчасце не ў золаце» можа стаць эфектыўным інструментам для засваення новага матэрыялу час рашэння вучэбна-пазнавальных задач.




З дапамогай схемы «Маё шчасце – гэта…» вучні выбіраюць прапанаваныя варыянты адказу або прадстаўляюць свае асабістыя погляды на шчасце. Падчас працы з творам праводзіцца слоўнікавая работа: абапіраючыся на інфаграфіку, вучні могуць знайсці тлумачэнне незразумелых слоў у тэксце і ў малюнках.

Вызначэнне ідэі твора падштурхоўвае вучняў да дыскусіі, дзе кожны можа прапанаваць свой адказ на пытанне «Калі шчасце не ў золаце, то ў чым?» Малюнкі ўнізе могуць стаць падказкай.

Твор «Шчасце не ў золаце» адносіцца да лірычнай прозы, мае адзнакі прозы і паэзіі, якія названы ў інфаграфіцы. Задача вучняў – даказаць гэта, аргументаваць, прывесці прыклады з твора.

Іншыя прыклады інфаграфікі, распрацаваныя да ўрокаў беларускай літаратуры ў 7 класе, можна паглядзець па спасылцы: https://drive.google.com/drive/folders/1LSNfp9yGrIIBWnBhZtbVdEacznL9cwz6?usp=sharing

Інфаграфіку кожны настаўнік па-свойму можа эфектыўна выкарыстаць у навучанні як:

- сродак матывацыі да вывучэння тэмы і рэфлексіі па яе выніках;
- сродак актуалізацыі наяўных ведаў вучняў па тэме;
- аснову для выканання заданняў па пераводзе інфармацыі з адной знакавай сістэмы ў іншую (напрыклад, скласці апавяданне, напісаць невялікі тэкст пэўнага стылю, скласці схему, запоўніць табліцу, падрыхтаваць вуснае выказванне);
- сродак рашэння вучэбна-пазнавальных задач, разбору канкрэтных сітуацый;
- сродак арганізацыі рознаўзроўневай дзейнасці вучняў;
- праблемнае поле для дыскусіі і работы над ключавымі пытаннямі.

У заключэнне варта адзначыць, што сучасныя тэхналогіі візуалізацыі дазваляюць паляпшаць і аптымізаваць працу настаўнікаў і вучняў (як сумесную, так і самастойную). Стварэнне і выкарыстанне інфаграфікі значна палягчае і падрыхтоўку да заняткаў, і сам працэс навучання ў рамках вучэбнай дзейнасці на ўроку, выпрацоўвае ў вучняў навыкі асацыятыўнага, творчага і сістэмнага мыслення, забяспечвае пераход навучэнца на больш высокі ўзровень кагнітыўнай дзейнасці, садзейнічае фарміраванню прадметных і метапрадметных кампетэнцый, стымулюе развіццё творчых здольнасцей.

## ЛІТАРАТУРА


1. Визуализация, эксперимент, взаимодействие: использование цифрового контента и ресурсов в педагогической деятельности [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://iro.gomel.by/images/doc/konferencii/28.02.2020.pdf/. – Дата доступа: 29.03.2022.
2. Теоретический материал по методике использования инфографики. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://infourok.ru/teoreticheskiy-material-po-metodike-ispolzovaniya-infografiki-2830044.html/. – Дата доступа: 12.04.2022.
3. Возможности применения инфографики на уроках литературы. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://infourok.ru/vozmozhnosti-primeneniya-infografiki-na-urokah-literaturi-3341834.html/. – Дата доступа: 12.04.2022.